Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №2(65), 2011

*УДК 398:72*

# Клець як мастацкі вобраз у беларускай каляндарна-абрадавай паэзіі

А. Г. Алфёрава

У артыкуле прыводзяцца матэрыялы, у якіх раскрываюцца асаблівасці ўспрымання клеці як мастацкага вобраза ў кантэксце каляндарна-абрадавых песень. Падкрэсліваецца важнасць гэтай пабудовы ў духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў, спецыфіка яе паэтычнага асэнсавання.
**Ключавыя словы:** каляндарна-абрадавая паэзія, міфа-паэтычныя ўяўленні, медыятар, міфалагічны персанаж, абрадавае дзеянне, гаспадарчыя пабудовы, клець.

The article gives materials revealing the perception features of a crate as an artistic image in the context of the calendar and ceremonial songs. It emphasizes the importance of this building in the Belarusians' spiritual and material culture, the specifics of its poetic descriptions.
**Keywords:** calendar and ceremonial poetry, myths and poetic representations, mediator, mythological character, ceremonial action, house constructions, crate.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Жылыя і гаспадарчыя пабудовы, іх структура і генезіс прыцягвалі да сябе ўвагу многіх даследчыкаў. Але асноўныя працы, прысвечаныя жыллю і асабліва гаспадарчым пабудовам, усё ж такі выступаюць прыярытэтам этнографаў і ў пэўнай ступені гісторыкаў і этналінгвістаў. У кожным этнаграфічным даследаванні асобны і даволі значны раздзел прысвячаўся клеці. А. Харузін у працы "Славянское жилище в Северо-Западном крае" адзначаў, што клець увогуле можна лічыць "першапродкам" хаты: "Клець толькі папярэднічала хаце, маючы ў сваю чаргу іншых, у сэнсе жылля, папярэднікаў, з якіх бліжэйшым была, верагодна, хіжа – зямлянка, замененая клеццю... Верагодна дапусціць, што клець была заменена хатай, жыллём самастойным" [11, с. 269]. Да прымітыўнага жылля перыяду агульнасці славянскіх плямён адносяць клець А. Бломквіст [2, с. 22], А. Лакотка [1, с. 225]. Этымалогію назвы даследчыкі звязваюць са значэннямі "будынак, пакой, келля, кладоўка", а таксама з асаблівасцямі пераходу ад слупавай да зрубнай канструкцыі (клетка) [8, с. 53].

Зразумела, што асаблівая ўвага да гэтай пабудовы непасрэдна вынікае з яе шматфункцыянальнасці. У першую чаргу клець мела гаспадарчае прызначэнне і служыла для захоўвання зернявых, ураджаю. У той жа час у летні перыяд клець выконвала функцыю жылой пабудовы: у ёй начавалі гаспадары. Менавіта ў клець пасля вяселля адпраўляліся маладыя, якія жылі там некаторы час, па сведчаннях А. Харузіна, нават да нараджэння дзіцяці [11, с. 272]. На двары магло быць некалькі клецяў, "па колькасці жанчын у доме, асабліва снох". Сумяшчэнне гаспадарчых і жылых функцый у міфапаэтычнай свядомасці выклікала нават уяўленне, што ў клеці жыў свой ахоўнік – клетнік: "Ён таксама прыносіў тут карысць, бо любіў прасушваць хлеб, перасыпаючы яго са жмені ў жменю" [9, с. 129]. У той жа час у параўнанні з хатнікам клетнік усё ж такі выконваў функцыі "дамавіка-гаспадара", а не ахоўніка сямейнага дабрабыту.

Адметнасць і цікавасць фальклору заключаецца ў тым, што ён дапамагае напоўніць рэальны свет, што акружае чалавека, у тым ліку і аб'екты матэрыяльнага побыту, самабытнай паэзіяй, хараством. Таму цікавымі ўяўляюцца даследаванні, што дапамагаюць спалучыць рэальнасць (а ёй у дачыненні да жылля, як адзначалася, займаецца этнаграфія) і міфапаэтычныя ўяўленні (а сфера іх захавання – фалькларыстыка). Свет рэальны і свет мастацкі, маючы шмат агульнага, у той жа час характарызуюцца і адметнымі ўласцівасцямі. Напрыклад, асноўная мэта каляндарна-абрадавых песень, прымеркаваных да пераломных гадавых перыядаў, заключалася ў тым, каб пры дапамозе вербальных сродкаў (замацаваных формул, прыгавораў, пажаданняў) паспрыяць будучаму добраму ўраджаю і, як следства, багаццю і дабрабыту сям'і. У выніку выканання пэўных рытуальна-абрадавых дзеянняў, па народных уяўленнях, можна было дапамагчы свету і прасторы (у тым ліку свайму двару, паселішчу) набыць гармонію, трываласць і ўстойлівасць. А паколькі найбольш блізкім для чалавека і ас-

ноўным для яго было менавіта бліжэйшае асяроддзе бытавання (уключала ў сябе навакольны ландшафт – лес, поле, луг, раку, возера, ручай; паселішча, вуліцу, двор, хату і гаспадарчыя будынкі), то і аб’екты гэтага асяроддзя цалкам падпарадкоўваліся напрацаваным і назапашаным у фальклоры формулам.

Мэта артыкула – на прыкладзе каляндарна-абрадавай паэзіі прасачыць міфапаэтычныя ўяўленні, звязаныя з клеццю, высветліць трансфармацыю гэтага вобраза ў мастацкім свеце каляндарна-абрадавай паэзіі.

У каляндарных песнях асноўнай характарыстыкай клеці будзе яе навізна: *“Да ці дома сам пан гаспадар? / Святы вечар!... / Да ці дома, дома да яго дачка? / Ой, нам казалі, што няма дома, / А ў* ***новай клеці*** *белы хусты качае”* [6, № 228]; *“Між* ***клеткамі****, між* ***новымі****... / Расце рожа чырвоная”* [3, № 259]; *“Купала на Йвана! / Братава залву на ноч звала: / Да ў мяне клетка новая”* [7, № 745]. Такі эпітэт становіцца цалкам зразумелы, калі ўзгадаць функцыю кожнага з цыклаў: калядныя песні, што выконваліся ў адпаведны перыяд, былі прымеркаваны да стварэння новага свету (пераход ад старога да новага года); блізкія да іх і валачобныя песні першапачаткова звязваліся з надыходам вясны, пачаткам новага земляробчага цыкла. Купальскія песні, прымеркаваныя да перыяду летняга сонцавароту, таксама адзначалі змену двух гадавых цыклаў. У такі памежны час у міфапаэтычнай свядомасці ўвесь свет нібы ствараўся нанава, гэта значыць павінен быў набыць гарманічнасць і ўпарадкаванасць.

На гаспадарчым двары клець магла або звязвацца з жылым звяном, або стаяць асобна. У некаторых варыянтах каляндарна-абрадавых песень яна таксама мае адасобленае становішча і нават у пэўнай ступені сапраўды можа ўяўляцца старажытным першапачатковым жыллём: *“На том беразе / Стаіць клетачка”* [6, № 590]. У адной з юраўскіх песень клетка ўвогуле знаходзіцца ў міфічным бары з незвычайнымі ўласцівасцямі: *– Юр’я, сыры бор гарыць! / – А што ў тым бару стаіць? / – Стаіць новая клетка”* [4, № 210].

Паколькі асноўным клопатам беларуса-земляроба быў багаты ўраджай, ад якога залежаў дабрабыт сям’і да пачатку наступнага земляробчага цыклу, то асноўнай характарыстыкай клеці ў каляндарных песнях, асабліва калядных, валачобных і жніўных, будзе з’яўляцца яе паўната (напоўненасць зернем): *“Ў клеці – карбамі, у пячы – пірагамі”* [6, № 259]; *“У тваёй клеці а насыпіста”* [3, № 109]; *“Поўны клеці карабамі”* [5, № 1]; *“Толькі магу я – у полі капамі, / А ў гумне стагамі, / А ў клеці засекамі”* [5, № 3 г]. На тое, што падобныя вобразы ў песнях выконвалі магічную прадуцыравальную функцыю, паказвае заўвага збіральнікаў: “Выконваючы такога роду песенькі, сыпалі па хаце зярнятамі і тым самым утваралі абрад “засявання”” [6, заўв. да № 605].

У той жа час і вобраз галоднай вясны перад пачаткам новага земляробчага года таксама пазначаецца праз вобраз клеці, але ўжо з адваротнай характарыстыкай – пустатой:

*Вясна красна,*
*Што ж ты нам прынясла?*
*– З пунькі сянцо*
*Вынесла, вынесла,*
*З току саломку*
*Вытрасла, вытрасла,*
*З клеці зярно*
*Вымела, вымела* [4, № 98].

На багацце гаспадаркі, заможнасць гаспадара ўплывае і тое, якія канкрэтна будынкі стаяць у яго на двары. Так, у дбайнага працаўніка павінны прысутнічаць усе віды гаспадарчых пабудоў, па якіх і будзе размеркавана яго дабро: *“У слаўнага пана, [пана] Пятра / Ёсць клетачкі і паветачкі”* [3, № 95]. А ў адной з купальскіх песень сустракаецца і вобраз клеці з прыбудовамі, што таксама ў кантэксце мастацкага свету дапамагае нешматлікімі выразнымі сродкамі стварыць уяўленне пра трываласць і надзейнасць пабудовы: *“Прыйдзі ка мне ноч начаваці, / Да цябе ў мяне ніхто не ўкрадзе: / Да ў мяне клетка з перакляткамі”* [10, № 472].

Каляднікі і валачобнікі заўсёды ўспрымаліся як медыятары паміж двума светамі, таму лічылася, што яны валодаюць незвычайнымі здольнасцямі і могуць паўплываць на будучы ўраджай і дабрабыт сям’і. Таму ў калядных і валачобных песнях важным структураўтваральным элементам выступаюць пажаданні (а калі сустрэнуць неадпаведны прыём – то і праклёны) гаспадарам. Таму адным з кампанентаў калядных і валачобных песень становіцца загад да гаспадароў ісці ў клець і прынесці пачастунак гасцям і іншым міфалагічным персанажам (напрыклад, казе): *“Ты ж, гаспадынька, не будзь такая, / Як была барабаніха, / А будзь лас-*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*кава, запалі свечачку, / Запалі свечачку да пайдзі ў клетачку, / Да набяры мачку на талерачку"* [6, № 545]; *"Гаспадарочак, слічны паночак... / Чаго спіш, ляжыш, вылягаешся... / Вазьмі свечачку, ідзі ў клецечку, / Ідзі ў клецечку па гарэлачку"* [3, № 128].

Так, у песнях пацвярджаецца яшчэ адна функцыянальная прызначанасць гэтай гаспадарчай пабудовы – захаванне прадуктаў: *"Каўбаса з клеці, а кішка з печы"* [Зп, № 138]; *"Скавародку ў печ, па яечкі – ў клець"* [3, № 52].

Акрамя ахарактарызаваных уласцівасцей клеці, якія падпарадкоўваліся абрадавым дзеянням і функцыям, у песнях, прымеркаваных да каляндарных цыклаў, вобраз клеці часам нясе значную псіхалагічную нагрузку. Так, у адным з варыянтаў, што выконваліся на Купалле, адбываецца супастаўленне клеці бацькоўскай і цесцевай, пад якія дзяўчаты сеюць гарох:

*Набяром, сястрыцы,*
*Жоўтага пясочку*
*І пасеем, сястрыцы,*
*Пад таткаву клетку.*
*А знаці, пазнаці,*
*Пясочак не ўзыдзець –*
*Нам у таткі не быці,*
*Вянкоў не насіці...*
*Набяром, сястрыцы,*
*Белага гарошку*
*І пасеем, сястрыцы,*
*Пад цесцеву клетку...*
*Гарошак узыдзе –*
*Нам у свёкаркі быці...* [10, № 380]

Такім чынам, асноўная функцыянальная прызначанасць клеці ў каляндарна-абрадавых песнях, у першую чаргу, заключаецца ў яе багацці, што сведчыць пра заможнасць сям'і, гаспадарлівасць і працаздольнасць яе членаў. У меншай ступені ў падобных песнях выражана маркіраванасць клеці як жылля дзяўчыны або маладых (такія рысы прасочваюцца часцей у каляндарна прымеркаваных варыянтах).

**Літаратура**


1. Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва ўсходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце: у 4 т. / навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск: Беларуская навука, 2008. – Т. 4. – Кн. 1. Беларускае народнае дойлідства / А.І. Лакотка. – 495 с.
2. Бломквист, Е. Э. Крестьянские постройки русских, украинцев и белорусов (поселения, жилища и хозяйственные строения) / Е. Э. Бломквист // Восточнославянский этнографический сборник. Очерки народной материальной культуры русских, украинцев и белорусов в XIX – начале XX в. / отв. ред. С. А. Токарев. – М., 1959. – Т. 31. – С. 3 – 458.
3. Валачобныя песні / склад.: Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей; склад. муз. часткі В І. Ялатаў; рэд. тома К. П. Кабашнікаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.
4. Веснавыя песні / склад.: Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей; рэд. тома К. П. Кабашнікаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 608 с.
5. Жніўныя песні / уклад. А. С. Ліса; уклад. муз. часткі В. І. Ялатаў; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 816 с.
6. Зімовыя песні / уклад., сістэматызацыя тэкстаў, уст. арт. і камент. А. І. Гурскага; рэд. М. Я. Грынблат. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – 736 с.
7. Купальскія і пятроўскія песні / уклад. А. С. Ліса, С. Т. Асташэвіч; уклад. муз. часткі Г. В. Таўлай; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 631 с.
8. Лакотка, А. І. Сцежкамі дзядоў: этнагр. нарыс / А. І. Лакотка, С. В. Барыс. – Мінск: Народная асвета, 1986. – 174 с.
9. Ленсу, Я. Ю. Таямніцы беларускай хаты / Я. Ю. Ленсу. – Мінск: Беларусь, 2007. – 167 с.
10. Паэзія беларускага земляробчага календара / уклад., сістэматызацыя тэкстаў, уст. арт. і камент. А. С. Ліса. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 613 с.
11. Харузин, А. Н. Славянское жилище в Северо-Западном крае. Из материалов по истории развития славянских жилищ / А. Н. Харузин. – Б.г., Б.м. – С. 163 – 501.


Институт искусствоведения,
Этнографии и фольклора им. К. Крапивы
НАН Беларуси

Поступило 12.07.2010

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ